16.00 «Кінапанарама».
17.00 «Да і пасля...». Год 1965.
18.05 «Летапіс паўстагоддзя». Дак. фільм. 1965 год.
18.55 «КВЗ-65».
21.00 «Кароль-алень». Маст. фільм.
22.15 «У танцавальных рытмах». Фільм-канцэрт. 1984 год.
23.00 «Гэтыя абаяльныя правінцыялы». Дак. фільм.
0.10 «600 секунд». 1989 год.
0.30 «Спяём, сябры!». Фільм-канцэрт.
2.45 «Бумеранг». М/ф.
4.00 «Любоў мая, тэатр... Марк Захараў». Дак. фільм.

### НАША КІНО

6.30, 12.30 Дэтэктыў «Два доўгія гудкі ў тумане».
8.30, 14.30 Камедыя «Труфальдзіна з Бергама».
10.45, 16.45 Драма «Жонка сышла».
18.30, 0.30 Трагікамедыя «Воблака-рай».
20.30, 2.30 Меладрама «Блукаючыя зоркі».
22.50, 4.50 Драма «Злачынства лорда Артура».

### ДОМ КІНО

3.00, 11.00 Серыял «Які памнажае смутак».
3.45 Прэм'ера. «Людны востраў».
5.45 Лірычная камедыя «Жыве такі хлопец».
7.25 Дэтэктыў «Інспектар Гул».
9.45 Кінаальманах «Сто грамаў «для храбрасці»...».
11.50 Экранізацыя школьнай праграмы. «Бег інаходца».
13.10 Сусветная прэм'ера. «Залатое сячэнне».
14.45 Камедыя «Звычайны цуд».
17.10 Новы хіт. Дэтэктыў «Раман выхаднога дня».
19.00 Серыял «Прапанаваныя абставіны». 1-я серыя.
19.55 Прэм'ера. «Кватарантка».
21.30 Крымінальная камедыя «Мама, не бядуй».
22.55 Меладрама «Продлись, продлись, очарованье...».
0.20 Камедыя «Спячы леў».
1.35 Кінараман «Сентыментальнае падарожжа на бульбу».

### ТБ-21

9.00, 17.00, 1.00 Драма «Чаліні. Злачыннае жыццё». 1-я серыя.
10.40, 18.40, 2.40 Драма «Чаліні. Злачыннае жыццё». 2-я серыя.
12.00, 20.00, 4.00 Камедыя «Авіда».
13.35, 21.35, 5.35 Драма «Калі ты апошні раз бачыў свайго бацьку».
15.15, 23.15, 7.15 Драма «Законы Брукліна».

### ТБ1000

3.00, 21.00 Драма «Распуста на экспарт».
5.00 Камедыя «Лёгкія паводзіны».
7.00 Драма «Жак-бядняк».
9.35 Драма «Краіна мары».
11.10 Камедыя «Хлопчыкі і дзяўчынкі».
13.00 Камедыя «Горад шчасця. Штат Тэхас».
15.00 Трагікамедыя «Эд Вуд».
17.10 Камедыя «Прывітанне, Біл!».
19.00 Камедыя «Тэрыторыя нявінніц».
23.00 Маст. фільм «Непрыбраныя пасцелі».
1.00 Меладрама «Бессмяротнасць».

### ТБ3

5.00 М/ф «Ліга справядлівасці».
5.30 М/ф «Гадзіла».
6.00 М/ф «Бакуган».
6.30 М/ф «Фостар: дом для сяброў з свету фантазій».
7.00 М/ф «Юху і яго сябры».
7.30 «Паляўнічыя на прывідаў».
8.00 Маст. фільм «Дзе знаходзіцца нофелет?».
9.30 «Як гэта зроблена».
10.00, 2.00 «Трэцяя планета ад Сонца». Серыял.
11.00, 3.00 Серыял «Усе мае былыя».
12.00 «Далёка і яшчэ далей».
13.00 Серыял «Мерлін».
15.00 Серыял «Падзея».
16.00 Дак. фільм «Настрадамус 2012».
18.00 Маст. фільм «Гісторыя Папялушкі».
20.00 Маст. фільм «Галава над вадой».
22.00 Серыял «Сховішча».
23.00 Серыял «Псі-фактар».
0.00 Маст. фільм «У тыле ворага».
4.00 Пакой страху

### РАМАНТЫКА

7.00, 18.40 «Гатуем разам з Анхелем Ласана».
7.55 «Паляванне на мільянера».
12.20, 17.50 «Смачнае захапленне+».
13.20 «Дасканалая прыгажосць».
19.35, 0.55 «Анучная лялька».
21.30 «Такое жыццё».
22.25 «Грошы для дачкі».
0.00 «Неўтаймоўная Хільда».
2.40 «Доля-ліхадзейка».

### DIVA UNIVERSAL

1.00 Серыял «Дэтэктывы пад сукном-IV».
1.50, 23.20 Маст. фільм «Слова гонару».
3.30 Маст. фільм «Дарога ў Хоп Роўз».
5.00 Серыял «Дочкі Маклеода-VII».
7.30 Серыял «Джордан расследуе».
9.10 Серыял «Сапраўдныя хатнія гаспадыні акругі Орындж-II».
10.50 Серыял «Дамы сям'і Гілмор-II».
13.20 Маст. фільм «Выдатны план».
15.00 Серыял «Міласэрнасць».
16.40 Серыял «Добрая жонка».
17.30 Серыял «Копы-навабранцы».
18.20 Серыял «Пляткарка-II».
20.00 Маст. фільм «Перш чым скажаш «так».
21.30 Маст. фільм «Калас назаўсёды».

### SyFy

7.30 Прытворшчык.
11.40, 17.30 Хэйвен.
13.20 Фантастыка «Палярная бура».
15.00 Легенда пра Шукальніка.
16.40 Склад № 13.
19.10 Па слядах прывідаў.
20.00 Жахі «Мега-піранья».
21.35 Баявік «Сем прыгодаў Сінбада».
23.15 Зачараваныя.
1.35 Кароткаметражныя фільмы.

### ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

5.00, 9.00, 13.00 Фільм-казка «Іван ды Мар'я».
6.25, 10.25, 14.25 М/с «Віні-Пух». М/ф «Мурзілка на спадарожніку».
7.00, 11.00 М/ф «Гунан-батор». М/ф: «Знікальнік», «Салодкая казка», «Вясёлая карусель» № 26.
8.00, 12.00 М/ф «Казка пра залатога пеўніка». М/ф «Генерал Таптыгін», «Міця і мікробус».
15.00 Фільм-казка «Старая, старая казка».
16.35 М/с «Віні-Пух ідзе ў госці». М/ф «Пінгвіны».
17.00 М/ф «Калядныя казкі».
18.15 М/ф «Здзяйсненне жаданняў».

### ЗДАРОЎЕ

5.00, 20.00 Курс лячэння.
5.30, 8.40, 11.45, 19.55, 20.30, 23.55, 1.55, 3.55 Азбука здароўя.
5.35, 20.35 Панацэя.
6.05, 21.20 Набалелае пытанне.
6.45, 22.00 Элемент здароўя.
7.20, 22.30 Жаночы часопіс.
7.50, 23.00 Ты тое, што ты ясі.
8.15, 23.30 Жыццё або Смерць?
8.45, 0.00 Не выходзячы з дому.
9.15, 0.30 Як Вы сябе адчуваеце?
9.45, 17.00, 1.05 Няёмкія хваробы.
10.45, 2.55 Памылкі здароўя.
11.15, 3.25 Увага, ежа!
11.50, 4.00 Зялёная аптэка.
12.20 Жыццё або Смерць?
12.45 Нетрадыцыйная медыцына.
13.15 Практыка здароўя.
13.55 Гісторыя хваробаў.
14.25 Сакрэты здароўя.
14.50 Пра дыеты і не толькі.
15.20 Найноўшыя дасягненні.
15.50 Як не страціць здароўе.
16.30 Пазнай сябе.
17.50 Цяга да жыцця.
18.30 Будзем здаровыя.
19.05 Вярні сабе маладосць.
21.05 Энцыклапедыя памылак.
2.00 Застацца ў жывых 2.
2.25 Я перамог гэты боль.
4.30 Тайны медыцыны.

### ТДК

6.00, 7.50, 10.50, 11.50, 13.00, 14.00, 14.50, 16.50, 17.50, 18.50 Парады ТДК.
6.25, 9.00, 14.55, 22.20 Усё лепшае, для вас.
7.25, 12.00, 18.00, 22.00, 5.00 Ваш доктар.
8.00 Добрай раніцы, каханая!
10.00, 17.00, 0.35 Красуня.
11.00, 14.00, 2.00 Нашы дзеці.
13.25, 4.00 Твой дом.
15.55, 20.00 Ваш асабісты псіхолаг.
19.00, 22.30 Люстэрка жыцця.
21.00, 23.30 Сэксуальная рэвалюцыя.
3.00 Гісторыя поспеху.

### DISCOVERY

7.00, 14.20 Аўтамайстэрні.
7.55, 2.55 Буянства тарнада.
8.50, 1.00 Смяротны ўлоў.
9.45 Выжыць любой цаной.
10.40 «Дзёрзкія праекты».
11.35 Ствараючы будучыню.
12.30 Мегабудоўлі.
13.25, 23.00 «У мяне атрымалася!».
15.15, 21.00, 5.10 «Пятая перадача».
16.10, 22.00, 6.05 Круты цюнінг.
17.05, 4.45 «Як гэта працуе?».
17.30 Цікава пра ўсё.
18.00 Сусвет Сцівена Хокінга.
20.00 Скрозь кратовую нару.
0.00, 3.50 Амерыканскія лесарубы.
2.00 У турме і на чужыне.

### NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00 Дэтэктывы-дайверы.
6.00 Паляванне на паляўнічага.
7.00 Смяротна небяспечны тузін.
8.00 Гіена.
9.00 Акулавы рай.
10.00 На кручку.
11.00 Укусі мяне, або Падарожжы вірусолага.
12.00 Дзікая прырода Расіі.
13.00 Здольнасці малпаў.
14.00 Тайны гарылаў.
15.00, 20.00, 1.00 Бушуючыя светы.
16.00 Навука рукапашнага бою.
17.00 Верталётныя баталіі.
18.00 Цуды інжынерыі.
19.00, 0.00 Расследаванні авіякатастроф.
21.00, 2.00 Вядомы Сусвет.
22.00, 3.00 Забароны.
23.00, 4.00 Асабліва строгі рэжым.

### TRAVEL

5.00, 10.00, 14.00, 21.00, 2.00 Сусветны падарожнік.
6.00, 16.00 Экзотыка ў жыцці.
7.00, 18.00, 23.30, 4.30 Сафі Грыгсан едзе на Усход.
8.00 Планета ежы.
9.00 Сусветная адысея Джуліяна і Камілы.
11.00 Круіз за паўночным ззяннем.
12.00 Шэф-кухар за мяжой.
13.00, 20.00 Падарожжы сёння.
13.30 Культурны шок.
15.00 Планета спорту.
17.00, 1.00 Пра галоўнае.
17.30, 23.00, 4.00 Галівуд і віно.
18.30 Прагны вандроўнік.
19.00, 0.00 Кулінарная Азія.
20.30, 1.30 Паглядзець за 48 гадзін.
22.00, 3.00 Працоўны водпуск.

### ANIMAL PLANET

7.00 Дзённікі паляўнічага на кракадзілаў.
7.50 «Самыя забаўныя жывёлы планеты».
8.40 Уводзіны ў катаводства.
9.35 Палі звярыных бітваў.
10.00 Уводзіны ў сабаказнаўства.
10.55 «Малпіна жыццё».
11.20 «Ветэрынары на маршы».
11.50, 13.40, 4.25 Паліцыя Маямі — аддзел па абароне жывёл.
12.45 Ветэрынары-стажоры.
13.10 «Ветэрынарная «хуткая дапамога».
14.35, 20.10 Перакладчык з сабачай.
15.30 Паляўнічы на кракадзілаў.
16.25 Незвычайныя жывёлы Ніка Бэйкера.
17.20 «Небяспечныя маршруты Макса».
18.15 Прыгоды Осціна Сцівенса.
19.10 Неверагодныя прыгоды са Сцівам Леанардам.
21.05 «У пячору льва».
22.00 Стварэнні ў тваім кашмары.
22.55 Паліцыя Фенікса — аддзел па абароне жывёл.
23.50 Паветраныя сківіцы 2.
0.45, 2.35, 5.20 Дзікія і небяспечныя.
1.40 Твар у твар з белым мядзведзем.
3.30 Здабыча — чалавек.
6.10 Аддзел па абароне жывёл.
6.35 Здабыча драпежніка.

### EUROSPORT

9.35, 13.00, 19.30 Тэніс. Турнір WTA.
11.00, 23.30 Вось гэта дзіва!!!
12.00, 18.30, 2.00 Ралі. Серыя IRC.
12.55 «Алімпійскія гульні. Лондан».
16.45, 0.30 Веласпорт. Тур Ламбардыі.
20.30 Байцоўскі клуб.
21.30 Кікбоксінг. Сусветная серыя.

### MTV

5.00, 2.10 Music.
6.00 Стэрэа_раніца. The Best.
9.10 «Губка Боб».
10.05 Наступны.
10.40 News блок Weekly.
11.10 Праверка чутак.
11.40 Зоркі на далоні.
12.10 Віртуаліці.
12.40 Страшна цікава.
13.10 Гарачае кіно.
13.40 «13 кіналаж».
14.10 «Магія Крыса Энджэла».
14.35, 22.40 «Цяжарная ў 16».
15.30, 23.35 «Тайна ад бацькоў».
16.25, 21.00 American Idol.
17.20 «MTV Special». Феномен Гагі.
18.20 Індустрыя моды.
19.10 Сапраўдныя прынцы і прынцэсы.
20.00 «Пакаленне MTV. Мы любім 90-я».
0.30 «Паўднёвы парк».
1.20 Зорны бой насмерць.

### ІНТЭР+

7.00 Вялікая палітыка.
9.05 Картата-патата.
9.45 Легенды крымінальнага вышуку.
10.15 Скептык.
10.45 Парк аўтамабільнага перыяду.
11.15 Гульні патрыётаў.
12.30, 4.30 Самы разумны.
13.55 Украінская топ-дваццатка.
15.15 Маст. фільм «Сваты-3».
17.00 Сямейны памер.
18.05, 1.00 Формула кахання Аляксандра Абдулава.
18.45, 1.50 Маст. фільм «Чахарда».
20.00, 3.00 «Падрабязнасці».
20.25 Вячэрні квартал.
22.00 Тыдзень моды.
22.30 Маст. фільм «Жанчыны жартуюць усур'ёз».
23.55, 3.25 Маст. фільм «Пацалунак».
6.00 Дак. фільм «Анатомія катастроф».

## 23.40 ФІЛЬМ ДНЯ

**«ФАНТАН»** (ЗША, 2006 г.)

У розныя часы людзі шукаюць адно і тое ж — Дрэва вечнага жыцця, схаванае Богам яшчэ да прыходу на Зямлю людзей. Хтосьці шукае велічы, хтосьці, як Томас, хоча выратаваць ад смерці каханую. Камусьці ніколі не суджана ўбачыць вялікае Дрэва, а нехта зможа знайсці яго, вось толькі ці адчуе ён пры гэтым радасць, бо Дрэва было схавана Богам ад людзей не проста так...



**Рэжысёр** — Дарэн Аранофскі. **У ролях:** Х'ю Джэкман, Рэйчал Вайс, Элен Берсцін, Марк Марголіс.

Казімір ФАРЫНО:

# «У мяне ёсць факты, калі са школьным дамашнім заданнем не змог справіцца чалавек, які скончыў Лінгвістычны ўніверсітэт!»



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Еўрапейская моўная палітыка сёння зыходзіць з таго, што кожны дарослы адукаваны чалавек павінен валодаць як мінімум дзвюма, а лепш — трыма замежнымі мовамі. Адной з іх абавязкова павінна быць англійская мова, другой — мова, запатрабаваная чалавекам з-за прафесійных і жыццёвых абставін, і трэцяя — нейкая рэгіянальная мова. Для беларуса гэта могуць быць англійская, нямецкая і польская ці англійская, нямецкая і літоўская мовы. «Веданнем англійскай мовы ўжо нікога не здзівіш — гэта, хутчэй, норма, чым эксклюзіў», — такую думку выказаў на прэс-канферэнцыі, прысвечанай Еўрапейскаму дню моў, які традыцыйна адзначаецца 26 верасня, часовы павераны ў справах Еўрапейскага саюза ў Рэспубліцы Беларусь Жан-Эрык Хольцапфель.**

**Праўда, для пераважнай большасці беларусаў авалоданне нават адной замежнай мовай расцэньваецца пакуль што як своеасаблівае дасягненне і перамога над сваім школьным мінулым. Уся справа ў тым, што прымяніць свае пазнанні ў замежных мовах на практыцы маглі толькі адзінкі з выхаванцаў савецкай школы. Аднак і пасля распаду Савецкага Саюза мала што змянілася. Сёння не толькі дарослыя, але і маладыя людзі прызнаюцца ў тым, што вельмі няўтульна адчуваць сябе, калі ім даводзіцца ўступаць у кантакты з іншаземцамі. Нават на бытавым узроўні пры адпачынку за мяжой ці ў замежных камандзіроўках у многіх узнікаюць праблемы з устанаўленнем кантактаў. Але ў бліжэйшыя гады гэтая сітуацыя павінна карэнным чынам змяніцца. Намеснік міністра адукацыі нашай краіны Казімір ФАРЫНО і рэктар Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Наталля БАРАНАВА ўпэўненыя, што для гэтага цяпер існуюць тры важнейшыя арганізацыйныя ўмовы, якія прыйшлі ў школу адначасова: гэта павелічэнне колькасці гадзін на вывучэнне англійскай мовы, дзяленне класаў на малакалькасныя падгрупы (ад 6 да 9 чалавек) і з'яўленне такога магутнага стымулу, як абавязковы выпускны экзамен у сярэдняй школе. Пра асаблівасці выкладання замежных моў у новым навучальным годзе ішла гаворка на рэспубліканскім семінары-нарадзе, што прайшоў у сценах Акадэміі паслядыпломнай адукацыі.**

— Тры гадзіны ў тыдзень, якія адводзяцца цяпер на вывучэнне замежнай мовы ў школе, і пяць гадзін у гімназіях — гэта дастатковы часавы патэнцыял, — упэўненая Наталля Баранава. — Цяпер толькі ад нас з вамі залежыць, як мы гэтым часам распарадзімся. Напрыканцы 90-х гадоў таксама павялічваўся час на вывучэнне замежнай мовы, але гэта не суправаджалася засваеннем новага зместу навучання і ўкараненнем на ўроках новых тэхналогій. У выніку школьнікі так і не навучыліся размаўляць на замежнай мове. Сёння на першае месца выходзіць развіццё ў школьнікаў гутарковай мовы. *Частка настаўнікаў не разумеюць да канца,* што азначае камунікатыўнасць у навучанні замежным мовам. Некаторыя настаўнікі памылкова лічаць, што калі яны на ўроку чыталі з вучнямі тэкст і задавалі пытанні да тэкста, то другая частка ўрока была камунікатыўнай. На самай справе гэта была толькі работа з тэкстам.

— Калі ўрок праходзіць у выглядзе маналогу настаўніка, то пастаўленай мэты — развіцця ў школьнікаў гутарковых навыкаў — вы ніколі не зможаце дабіцца, — падкрэсліў Казімір Фарыно. — Для чаго мы пайшлі на дзяленне класаў на тры групы — каб у настаўніка быў час для зносін з кожным вучнем і можна было ўлічыць індывідуальныя асаблівасці і здольнасці да навучання кожнага дзіцяці. Нават не думайце рабіць урокі замежнай мовы парнымі.

Па словах Наталлі Баранавай, *змяншэнне колькасці вучняў у групе не спрашчае, як памылкова мяркуюць некаторыя настаўнікі, а ўскладняе работу педагога, паколькі яму цяпер даводзіцца вырашаць зусім іншыя задачы*. 45 хвілін даюцца для таго, каб пагрузіць усю групу ў іншамоўнае асяроддзе — увесь урок павінен праходзіць на замежнай мове. «Прызнаюся, мяне трывожаць настаўнікі, якія выкладаюць, але самі не размаўляюць на замежнай мове, — канстатавала Наталля Баранава. — Важнае значэнне мае таксама спрыяльны псіхалагічны клімат на ўроку, бо ў процілеглым выпадку, калі дзіця пастаянна баіцца дапусціць памылку, яго свядомасць сціскаецца і не пускае ў сябе іншамоўную інфармацыю.

— Вельмі шмат будзе залежыць ад першага настаўніка, які ўводзіць дзіця ў свет замежнай мовы, — дадаў Казімір Фарыно. — Важна не адбіць у дзіцяці жаданне вывучаць замежную мову. Я вам скажу адкрыта: добрымі трэба быць да дзяцей. Мяне вельмі трывожыць, што дабрыня пакідае школу. Замежныя мовы пачынаюць вывучаць цяпер з трэцяга класа, а ў першым і другім класах практыкавалася безадзнакавае навучанне. І дзецям вельмі цяжка прызвычаіцца да новых умоў. Таму стаўцеся да іх больш ашчадна. Устрымлівайцеся ад нізкіх адзнак. Нельга «на старце» адбіць у дзяцей жаданне вывучаць замежную мову, затым сітуацыю будзе цяжка пераламаць.

Асобная праблема — гэта хатнія заданні.

— Вы ведаеце, чаму ў Мінску сёння самыя запатрабаваныя рэпетытары менавіта па замежных мовах? — пацікавіўся ў педагогаў Казімір Фарыно. — Таму што вы задаяце сваім вучням такія дамашнія заданні, з якімі самастойна справіцца проста немагчыма. Той вучэбны матэрыял, які вы не адпрацоўваеце разам з вучнямі на ўроку, дзеці вымушаныя самастойна асвойваць дома. У мяне ёсць канкрэтныя факты, калі са школьным дамашнім заданнем не змог справіцца чалавек, які скончыў Лінгвістычны ўніверсітэт. Тым больш бацькі нічым не могуць дапамагчы свайму дзіцяці.

— Я ведаю выпадкі, калі вучням пятых, шостых і сёмых класаў даюцца дамашнія заданні творчага характару, што абсалютна недапушчальна, — дадала Наталя Баранава. — Дамашнія заданні павінны мець трэніровачны характар і быць накіраваныя на замацаванне таго вучэбнага матэрыялу, што дзеці праходзілі на ўроку.

**Даведка «Звязды»:**
**Самай распаўсюджанай мовай у Еўропе лічыцца руская. Каля 150 мільёнаў жыхароў Еўропы называюць сваёй роднай мовай менавіта яе. На другім месцы па распаўсюджанасці стаіць нямецкая мова — у Еўропе налічваецца амаль 95 мільёнаў яе носьбітаў. А французскую мову лічаць роднай больш як 65 мільёнаў еўрапейцаў.**

Закранула Наталля Баранава і пытанні ўкаранення абавязковага школьнага выпускнога экзамену па замежнай мове, які ўпершыню будзе праведзены ў 2013 годзе. Экзамен быў задуманы як магутны фактар стымулявання інтарэсу да авалодання замежнай мовай, якая да апошняга часу ўваходзіла ў пералік экзаменацыйных дысцыплін, з якіх выпускнік мог выбіраць. Напрыклад, у гэтым годзе замежную мову пажадалі здаваць толькі 3 382 выпускнікі па краіне (у Мінску — 926). Не сакрэт, што папулярнасці выпускнога экзамену па замежнай мове зусім не спрыяла неадпаведнасць патрабаванняў да выпускнога экзамену ў школе і патрабаванняў цэнтралізаванага тэсціравання, дзе на першы план выходзіць праверка граматыкі, лексікі, але не гутарковай мовы.

**Даведка «Звязды»:**
**Ва ўстановах адукацыі працуюць больш як 11,6 тысячы настаўнікаў замежнай мовы: 8172 настаўнікі англійскай, 2682 — нямецкай, 655 — французскай і 122 — іспанскай мовы. 74 працэнты беларускіх школьнікаў вывучаюць англійскую мову, 20,5 працэнта — нямецкую, 4,3 працэнта — французскую і 0,8 працэнта — іспанскую. Кітайскую мову вывучаюць 350 маленькіх беларусаў.**

Па даручэнні Міністэрства адукацыі для распрацоўкі фармату вуснага выпускнога экзамену на базе Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта была створана рабочая група.

— Як мы пераканаліся, многія педагогі ставяцца да ўвядзення абавязковага выпускнога экзамену з такой асцярожнасцю, што даводзіцца канстатаваць няўпэўненасць асобных настаўнікаў (а дзе-нідзе і цэлых калектываў) ва ўзроўні маўленчай падрыхтаванасці іх вучняў, — паведаміла Наталля Баранава. — Некаторыя рэспандэнты выказалі меркаванне, што «аўдзіраванне, магчыма, лішні від дзейнасці на экзамене на базавым узроўні». Прабачце, але ў Беларусі сёння няма падзелу ў навучанні замежным мовам на ўзроўні (базавы, павышаны і паглыблены). Падчас анкетавання прагучала меркаванне, што шэраг школ тэхнічна не гатовыя арганізаваць і правесці аўдзіраванне, паколькі ў іх няма лінгафонных кабінетаў. Я лічу, што на ўроках лінгафонныя кабінеты ўвогуле не патрэбныя. А ў тое, што ў нас ёсць школы, дзе няма хоць бы аднаго магнітафона з навушнікамі, верыцца з цяжкасцю. Хачу нагадаць, што ў 60-я гады XX стагоддзя ў школах таксама праводзіўся абавязковы экзамен па замежнай мове з аўдзіраваннем, і гэта не выклікала праблем нават у тыя часы. Дык чаму цяпер узнікаюць такія праблемы? У любым выпадку ў нас яшчэ ёсць час, каб падрыхтавацца да экзамену.

Работнікі Лінгвістычнага ўніверсітэта прааналізавалі экзаменацыйныя матэрыялы, якія выкарыстоўваліся на выпускных экзаменах у школах у 2008 і 2009 гадах. *Высветлілася, што (за рэдкім выключэннем) экзамен не быў камунікатыўным, а тэксты білетаў утрымлівалі памылкі, дзе-нідзе — шматлікія.* Сітуацыі, якія прапаноўваліся выпускнікам для гутаркі, дазвалялі проста пераказаць частку вучэбнай тэмы. «Гэта не гутарка, а, хутчэй, узнаўленне», — падкрэсліла Наталля Баранава.

Якім жа бачыцца будучыня выпускнога экзамену? У цэнтры будзе знаходзіцца маўленчая дзейнасць вучня. Плануецца вусная праверка ўзроўняў разумення і гаварэння на аснове прачытанай інфармацыі (пісьмовага тэкста), прапанаванай сітуацыі і аўдзіравання. Мяркуецца, што пры ацэнцы гаварэння на аснове прачытанага тэкста заданне будзе прапаноўвацца вучню загадзя, і той будзе мець магчымасць падрыхтавацца да адказу. Таксама прадугледжваюцца заданні тыпу «знайдзі ў тэксце і прачытай». Камунікатыўная сітуацыя можа задавацца на падставе прадугледжанага школьнай праграмай прадметна-тэматычнага зместу гутаркі. Плануецца, што гутарка з экзаменатарамі будзе праходзіць без папярэдняй падрыхтоўкі, але яе характар, а таксама паслядоўнасць, у якой будуць задавацца пытанні, дазволяць вучню часткова абапірацца на вывучаны ім матэрыял. А падчас аўдзіравання будзе правярацца так званае спантаннае, непадрыхтаванае гаварэнне.

Усё гэта пакуль што толькі папярэдняе бачанне выпускнога экзамену. І тут важна ўлічыць меркаванні ўсіх настаўнікаў. Школам і гімназіям, якія пажадаюць супрацоўнічаць па гэтым пытанні, могуць быць прапанаваныя для апрабацыі розныя варыянты заданняў. І толькі пасля гэтага з'явяцца першыя зборнікі дыдактычных матэрыялаў да экзамену. Падчас анкетавання ўсе настаўнікі без выключэння выказалі пажаданне мець узоры экзаменацыйных матэрыялаў, зборнікі тэкстаў для чытання і матэрыялы для аўдзіравання. Гэта заяўка школы, якую трэба абавязкова выканаць.

Педагогаў павінна зацікавіць наступная інфармацыя, якую агучыла Наталля Баранава: 1 кастрычніка на базе Цэнтра лінгвістычнай адукацыі МДЛУ адкрыўся кансультацыйны пункт, дзе настаўнікі могуць атрымаць рэкамендацыі па пытаннях выкладання ў школе замежных моў ад вядучых спецыялістаў універсітэта.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Услед за лістом

# ПРАЎДА ЗАЎСЁДЫ АДНА

**«Мне вельмі патрэбна дзяржаўная дапамога. Мне вельмі патрэбны санаторый з суправаджэннем... Пуцёўка патрэбна майму дзіцяці...» Так пачынаўся ліст, дасланы ў «Звязду» жыхаркай Баранавічаў Надзеяй Г., і гэтымі ж словамі ён заканчваўся.**

Жанчына падрабязна пералічыла ўсе хваробы, якія наваліліся на яе 14-гадовага сына, іх набралася вельмі шмат.

Надзея Г. — інвалід другой групы, яе сын Валерый таксама інвалід. Сям'і прыходзіцца цяжка, а на ўсе скаргі ніхто не звяртае ўвагі. Вось такое склалася ўражанне пасля знаёмства з дасланым пісьмом і размовы з жанчынай.

А затым высветлілася, што летась Валерый быў у санаторыі, і цяпер трэба пачакаць, пакуль падыдзе чарга. Я патэлефанаваў Надзеі Г. і растлумачыў сітуацыю. Маўляў, неабходна пачакаць, бо не вам адным патрэбен санаторый. Але мае словы наўрад ці былі пачутыя, а спрачацца і даказваць нешта не хацелася.

Падумалася, што на гэтым усё закончыцца, але Надзея Г. патэлефанавала позна вечарам, калі я ўжо спаў.

— У школе адмовілі вучыць сына дома, — заявіла жанчына.

Вось тут я і вырашыў давесці справу да канца і разабрацца ў праблеме, хоць быў далікатны момант і не хацелася яго закранаць. Надзея Г. знаходзіцца на ўліку ў псіха-неўралагічным дыспансеры. Праўда, гэтага жанчына не ўтойвае, але тым не менш.

Існуе маральна-этычны фактар, але лёс дзіцяці пераважвае яго. Настаўнікі часта прыходзяць да вучняў дадому, і ў гэтым сёння нічога няма надзвычайнага. А тут такое хворае дзіця, і школа засталася абыякавай да яго.

Валерый вучыцца ў спецкласе СШ № 10, і я выйшаў на **намесніка дырэктара па вучэбнай рабоце Марыну КУПЦОВУ**.

*— Наконт таго, каб вучыць Валеру дома, у нас няма ніякіх афіцыйных дакументаў, — заявіла Марына Георгіеўна, — хлопчык можа вучыцца ў школе, фізічна ён выглядае не такім ужо хілым. Дарэчы, Валера атрымлівае бясплатныя падручнікі і двухразовае харчаванне.*

— Калі так, то чаму ўзнікла пытанне, што хлопчыка павінны вучыць дома?

*— А гэта жаданне маці. Яна сына абследуе і прыходзіць да такога выніку, але ж заключэнне неабходна атрымаць ад дактароў. Мы маці кажам: «Дайце нам хоць нейкі дакумент, і тады не будзе ніякай праблемы». Але яна нічога не прынесла.*

Потым была кароткая размова з **дырэктарам школы Міхаілам ДАРАШЭНКАМ**.

*— Што тут можна сказаць? Вось такую жанчына заняла пазіцыю і ўжо ўсіх дастала сваімі скаргамі! А наконт здароўя вучня вам за лепшае будзе пагаварыць з галоўным урачом дзіцячай паліклінікі,* — параіў дырэктар.

І ўсё ж пытанне заставалася. Падлетак вучыцца ў спецкласе, а тады чаму ён там апынуўся? Так захацела маці?

**Галоўны ўрач гарадской дзіцячай паліклінікі Людміла ЛЯШЧЫНА,** пачуўшы прозвішча жанчыны, уздыхнула:

*— У якіх кабінетах яна толькі не была! Сын ляжаў на абследаванні ў Баранавіцкай бальніцы, і ў яго нічога не знайшлі.. Цяпер ён знаходзіцца ў Брэсце ў абласной дзіцячай бальніцы. Ужо там, напэўна, зробяць заключэнне. У хлопца ёсць асаблівасці ў развіцці, але ніякіх пухлін няма, і ён можа, як іншыя вучні, хадзіць у школу. Яму нават неабходна быць у калектыве, каб развівацца разам з астатнімі вучнямі, а не сядзець у чатырох сценах з маці.*

— А з чым звязана, што Валера часта прапускае заняткі? Хварэе?

*— Маці кажа, што, напрыклад, раніцой сына не можа разбудзіць у школу. Але ж мы ведаем дзяцей. Калі ёсць магчымасць «сачкануць», не пайсці ў школу ці выкарыстаць яшчэ нейкую палёгку, то яны гэта ўмеюць.*

— А якое ў такой сітуацыі выйсце?

*— На мой погляд, неабходна аформіць апякунства і вывесці хлопца з-пад уплыву маці. Няхай ім займаецца яго сястра. Яна дарослая і, на маю думку, сур'ёзны чалавек, закончыла ўніверсітэт...*

— Людміла Аляксееўна, але ж няўжо нешта істотна зменіцца? Маці, як і раней, будзе побач.

*— А калі хлопца забраць з сям'і і адправіць у інтэрнат, то няўжо яму там будзе лепш? Як бы ні было, а маці ўсё ж да дачкі прыслухоўваецца.*

Кожны можа захварэць, але і хворы знаходзіцца ў сям'і, кантактуе з іншымі людзьмі, і мы павінны ставіцца да яго паблажліва, хоць зрабіць гэта часта не проста. Праўда заўсёды адна, а бывае хворы чалавек навязвае сваю...

Што датычыцца матэрыяльнага становішча сям'і Надзеі Г., то думаю, што яно складанае.

«Даходы вельмі маленькія... атрымліваю матэрыяльную дапамогу ў пенсійным фондзе», — напісала жанчына.

Але такая праблема датычыцца не толькі гэтай сям'і. Магчыма, настаў час пераглядзець сацыяльную палітыку ў цэлым. Найперш дапамога павінна аказвацца той катэгорыі насельніцтва, якая, напрыклад, па стане здароўя не можа атрымаць дастатковы даход. А не раскладваць, як тыя ж датацыі за камунальныя паслугі, аднолькава на ўсіх. Тут павінны сказаць сваё слова дэпутаты...

Каб давесці нашу размову да лагічнага завяршэння, патэлефанаваў у аддзел адукацыі гарвыканкама і пацікавіўся:

— А што, Надзею Г. пазбавілі бацькоўскіх правоў, калі апякунства вырашылі перадаць яе дачцэ?

*— Не, яна бацькоўскіх правоў не пазбаўленая, бо гэта ў нашай сітуацыі не абавязкова. У нас ёсць заключэнне медкамісіі, што жанчына не можа выконваць бацькоўскія функцыі,* — адказала **загадчыца сектара аховы дзяцінства Святлана ЮРЧЫК**.

— Наколькі працяглы працэс афармлення апякунства?

*— Пытанне будзе закрытае да 16 кастрычніка. У дачкі Г. добрая праца, вышэйшая адукацыя, і характарыстыкі ёй далі станоўчыя. Ёсць падстава лічыць, што сітуацыя зменіцца да лепшага.*

Няхай так і будзе. Галоўнае, што зробленыя захады, каб гэтую сітуацыю выправіць.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## У САДОК — ЗА ХАБАР

У Брэсце затрыманая 25-гадовая гараджанка, якая падбухторвала 22-гадовую маці даць хабар загадчыцы дзіцячага садка па вуліцы МАДРа за станоўчае вырашэнне пытання з уладкаваннем у дзіцячы сад малога. Тая атрымала ад указанай жанчыны 50 долараў. Далей з усімі фігурантамі справы будзе разбірацца следства.

## МІНЫ І ГРАНАТЫ ТРЫМАЎ У КВАТЭРЫ

У Брэсце затрыманы 50-гадовы беспрацоўны гараджанін, які доўгі час займаўся несанкцыянаванымі раскопкамі ў месцах баёў мінулай вайны. Зброю і боепрыпасы, якія знаходзіў, захоўваў у сваёй кватэры і падвале жылога дома. Пры затрыманні ўладальніка «арсенала» супрацоўнікі ўпраўлення КДБ па Брэсцкай вобласці ў жылым памяшканні і падвале знайшлі стралковую зброю, супрацьпяхотныя міны, некалькі гранат. Боепрыпасы адразу былі абясшкоджаныя сапёрна-піратэхнічнай групай.

## ЭПІДЭМІЯ «МІНЁРАЎ»

Не так даўно паведамлялася пра званкі ў міліцыю Брэстчыны наконт узрыўных устройстваў у будынку банка Жабінкі, а таксама Брэсцкай крэпасці. І вось зноў навіна. Паводле інфармацыі прэс-службы Брэсцкага абласнога УУС, у Столінскі райаддзел міліцыі патэлефанаваў незнаёмы і паведаміў, што ў бар «Славянскі» зайшлі двое мужчын і жанчына з падрыўным устройствам. Як і чакалася, праверка ніякіх небяспечных рэчываў не выявіла. Аўтар званка быў устаноўлены, ім аказаўся 24-гадовы нецвярозы жыхар пасёлка Рэчыца.

**Яна СВЕТАВА.**

Анатоль БУЯЛЬСКІ:

# «Наша каманда кідае суперніка з адной крайнасці ў іншую. Ад поўнай пагарды да панічнага страху»



Фота БЕЛТА.

**Складана нават уявіць, што адбывалася б, калі, скажам, наша футбольная зборная заняла чацвёртае месца на чэмпіянаце свету. Той факт, што наша жаночая баскетбольная каманда спынілася ў кроку ад п'едэстала, асаблівага ажыятажу не выклікаў. І галоўны трэнер Анатоль Буяльскі лічыць, што бытавыя праблемы, якія існуюць у камандзе, яе выдатнае выступленне вырашыць не дапаможа. Анатоль Сяргеевіч расказаў, чаму ўвесь турнір правёў у адным пола, як каманда Расіі сама сябе закапала і чаму думкамі ён дагэтуль на чэмпіянаце свету.**

***— Анатоль Сяргеевіч, хто з сапернікаў уразіў асабіста вас на турніры ў Чэхіі?***

— Каманда ЗША. Хоць ніякіх навінак для сябе я там не ўбачыў, але пра такую арганізаванасць, арганізацыю каманды можна толькі марыць.

***— Вы адчуваеце, што вашу каманду баяцца супернікі і па-асабліваму настройваюцца?***

— Наша каманда кідае суперніка з адной крайнасці ў іншую. Ад поўнай пагарды да панічнага страху. Гэтыя хваляванні — нястрымная радасць і безуцешнае гора — прыкметы шызафрэніі. І ў спорце такі стан небяспечны. Каманда Расіі выйшла супраць нас з поўнай пагардай. І калі літаральна праз некалькі хвілін адчула, што трэба нешта рабіць, закапала сябе цалкам. Заўсёды трэба памятаць, што на такіх турнірах няма слабых каманд. Калі зборная трапіла ў 16 наймацнейшых у свеце, значыць, гэта не выпадкова. У баскетболе — не ведаю, як у іншых відах спорту, — выпадкова трапіць на топ-турнір немагчыма. Мы ішлі ў фінал чэмпіянату Еўропы 2007-га года, пачынаючы з 2004-га: 2004-2005 — група B, 2006 — адборачныя спаборніцтвы да чэмпіянату Еўропы, 2007 — фінальная частка чэмпіянату Еўропы. Чатыры гады спатрэбілася, каб трапіць на адборачны алімпійскі турнір. Мы выйгралі яго і трапілі на Алімпіяду. Пяць гадоў спатрэбілася на тое, каб трапіць на Алімпійскія гульні. Да гэтага трэба прыплюсаваць чацвёртае месца ў Латвіі на чэмпіянаце Еўропы. Так што мы толькі праз шэсць гадоў трапілі на чэмпіянат свету. Праўда, у баскетболе гэта лічыцца «звышгукавой» хуткасцю.

Можна мець выдатную інфраструктуру, вялікія грошы, шыкоўную базу для падрыхтоўкі — і не трапляць на чэмпіянат свету. Вы не ўяўляеце, колькі высокаразвітых краін, найбагацейшых федэрацый марыць быць на нашым месцы. Там бы гаворка не ішла пра трусы, майкі і сукенкі, з чым мы піарымся. Былі б дамы, аўтамабілі і параходы. Але тая ж каманда Турцыі, для якой трапіць на чэмпіянат свету было справай жыцця, не змагла прайсці адбор. Трапіць на Алімпіяду яшчэ больш складана. А мы гуляем там. І не проста выступаем. Наша каманда ўжо ў многіх выклікае сверб. У міжнародных федэрацыях баскетбола — еўрапейскай і сусветнай — Беларусь нікім не прадстаўленая. Многія ў свеце нават не ведалі пра нас і нашу краіну. Калі я на Алімпіядзе ў Пекіне падарыў аднаму іспанскаму трэнеру, легендзе еўрапейскага баскетбола, значок нашай федэрацыі, ён ашалеў ад шчасця. Ён 50 гадоў збірае значкі, і наша федэрацыя — адна з нямногіх у свеце, не прадстаўленая дагэтуль у яго калекцыі. Нас цяпер пазнаюць, паважаюць. Пасля перамогі над Расіяй усё перавярнулася на 360 градусаў.

***— У чым гэта праяўлялася?***

— У звычайных адносінах — калі да цябе бягуць праз увесь хол гасцініцы, калі цябе не прапускаюць, каб пагаварыць.

***— А якімі былі адносіны да вас у кулуарах пасля гульні з Чэхіяй? Спачувалі?***

— Так. І нягледзячы на забарону для судзейскага корпуса абмяркоўваць працу калег, нават з іх боку былі спачуванні, не кажучы пра афіцыйных і неафіцыйных асобаў. Асабліва ў частцы апошняга фола Верамеенкі — там усё было адназначна. Гэта абуральны факт, які меў месца на турніры такога ўзроўню, у ключавы момант гульні, супраць такога гульца! У сусветным баскетболе Верамеенка — не радавы гулец. Калі пяць фалоў ціхенька далі Ануфрыенцы, ніхто не заўважыў. Асмеліцца на прызначэнне фола ў гэтай сітуацыі такому гульцу як Верамеенка, здольны не кожны суддзя. Гэта быў своеасаблівы крык душы з боку гаспадароў спаборніцтваў. Але рэалізуй Марчанка апошні кідок, усё было б па-іншаму. На секунду ўдача адвярнулася ад нас...

***— Чаму, нягледзячы на пастаянныя выдатныя выступленні, адносіны да зборнай застаюцца ранейшымі?***

— Гэта пытанне не да мяне. Я не ведаю.

***— Вы будзеце зноў ставіць свае пытанні тым, каму павінны?***

— Я ставіў іх шмат разоў — у розных ракурсах і пад рознымі вугламі. Вынік вы бачыце. На прэзентацыі сукенак зборнай я ўпершыню адчуў сябе госцем на чужым свяце. Пра якія сукенкі можна казаць, калі я дзевяць матчаў правёў у адным пола? Я не ведаю, што такое насіць адну сарочку два дні, а тут я правёў у ёй 11 дзён. Аднойчы я яе памыў, праўда, у халоднай вадзе, каб не дай Бог, яна не страціла выгляду. Таму ў мяне алергію выклікалі пытанні пра адзенне. Па простай прычыне: верхняга адзення, у адрозненне ад іншых камандаў, у нас не было. А пра пола сумніўнай, дарэчы, якасці, са зрэзанымі біркамі, я ўжо казаў. Я з усіх сіл імкнуся быць аптымістам, але калі бірка на пола зрэзаная, значыць, не ўсё ў парадку!

***— Зараз атрымліваецца, што ў перамогі шмат бацькоў...***

— Ну і на здароўе, у мяне да гэтага прэтэнзій няма. Па-добраму хочацца дапамагчы Камянкову (старшыня фэдэрацыі баскетбола. — **Аўт.**). Гэта дзяржаўны чалавек, які ўзяўся за такую нялёгкую справу. Ён выконвае вялізны аб'ём працы. І я вітаю яго ініцыятыву — стварэнне клуба «Гарызонт», дзе мне, дарэчы, прапанавалі працаваць. Многія, праўда, адразу сказалі: «Гэта вельмі дрэнна, што Буяльскі будзе працаваць у клубе». Калі я працаваў за мяжой і са зборнай, мяне таксама абвінавачвалі, што я працую з клубам і быццам бы не ведаю праблем беларускага баскетбола. Потым перад Алімпіядай я перастаў працаваць з клубам, зноў пайшлі размовы, што я не магу працаваць толькі ў зборнай. Я пакуль яшчэ не ўзяўся за «Гарызонт», не правёў ніводнай трэніроўкі, але ўжо кажуць, што гэта няправільна. Гэты клуб ствараецца дзеля таго, каб маладыя баскетбалісткі, якія яшчэ не сталі паўнацэннымі гульцамі нацыянальнай каманды, не з'язджалі адразу ў нікуды. Каб яны вучыліся тут, а стаўшы Леўчанкай, Трафімавай, Марчакай і Верамеенкай, маглі ехаць далей. Ці тут застацца, калі будуць нармальныя ўмовы.

***— Вы ў зборнай шмат гадоў. Што дапамагае вам працаваць?***

— Адсутнасць страху за вынік. Я ніколі не баяўся таго, што мяне заўтра могуць звольніць з працы. Да гэтага трэба быць гатовым. Я ведаю, што без падзення не бывае ўзлётаў. Таму, калі лёс падрыхтуе новы ўдар ці ўрок, мне прыйдзецца аступіцца, гэта нагода для таго, каб зноў узлятаць.

***— Думкамі вы яшчэ падчас авертайма гульні з Чэхіяй ці ўжо вярнуліся дадому?***

— Пакуль мы з дзяўчатамі яшчэ не перайшлі на нармальнае зямное жыццё. Я кожную раніцу прачынаюся ў 4-5 гадзін. Вочы ў столь. І знаходжуся ў тым рэжыме, які быў на чэмпіянаце. Гэта нават не авертайм з Чэхіяй, а штосьці нявызначанае.

***— Зараз што-небудзь змянілі б у вашых рашэннях, якія прымалі на чэмпіянаце?***

— Я не прыхільнік капацца ў тым, чаго не зменіш. Нядаўна ў адной з газет выйшаў артыкул. Яго напісалі буйныя спецыялісты, якія ведаюць, што трэба было рабіць. Аказваецца, мы ўзялі не тых людзей, выканалі не тыя дзеянні. У Амерыцы правільныя адносіны да ўсяго гэтага. Яны не займаюцца самаедствам, не забіваюць сябе. Трэба ведаць, што заўтра будзе новы дзень, зноў узыдзе сонца. І трэба думаць не пра тое, што ты прайграў, а як зрабіць так, каб заўтра выйграць. Лепш усё рабіць на аптымізме, нават дрэнныя справы. Праўда, дрэнных спраў лепш не рабіць зусім.

***— Для дзяўчат вы псіхолаг. Хто псіхолаг для вас?***

— Людзі, якія мяне акружаюць. На жаль, з кожным годам кола стасункаў становіцца ўсё больш вузкім. Напэўна, я цяжкі чалавек і са мной складана. Асноўная падпітка — мая сям'я — жонка і дзеці, а таксама ўжо і ўнукі. Там я адчуваю сябе, як за высокай-высокай агароджай, куды ніхто не можа прабрацца.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

г. ВИТЕБСК 26.10.2010

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

| № лота | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 2. | Капитальное строение, расположенное по адресу: г. Витебск, Смоленская площадь, 12, и право заключения договора аренды земельного участка. | Характеристика объекта недвижимости: памятник архитектуры конца XIX начала XX вв., расположен в границах охранной зоны исторического р-на, здание двухэтажное кирпичное, общая площадь 480 кв.м, фундамент бутовый ленточный, перекрытия железобетонные, крыша шиферная и металлическая. Земельный участок: с кадастровым номером 240100000001000670, площадь 0,1323 га для обслуживания здания, сроком аренды 50 лет. Ограничения в использовании земель в связи с нахождением в санитарно-защитных полосах водопроводов площадью 0,0014 га. **Назначение и использование участка** – размещение кафе, гостиницы, выставочного зала, бытовых услуг, административных помещений. | **781 891 214** | **78 189 120** |
| 3. | Здание магазина, расположенное по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, г. Городок, ул. Вокзальная, 40а, и право заключения договора аренды земельного участка. | Начальная цена объекта недвижимости снижена на 50 % Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 201/С-11334 – здание специализированное розничной торговли (магазин) – одноэтажное кирпичное здание 1974 г. постройки, общей площадью 457,2 кв.м, фундамент бетонный, перекрытия – ж/б плиты; крыша рулонная, с кирпичным тамбуром, двумя кирпичными сходами в подвал, железобетонным подвалом и асфальтобетонным покрытием. Земельный участок: площадью 0,0625 га, сроком аренды 99 лет, кадастровый номер 221850100001003220, для размещения объектов розничной торговли. Ограничение в использовании всего участка в связи с нахождением в водоохранной зоне реки, а также охранная зона линии электропередач напряжением до 1000 В на площади – 0,0026 га. | **45 292 537** | **4 529 250** |
| 4. | Здание фельдшерско-акушерского пункта, расположенное по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, г. Городок, ул. Вокзальная, д. 53, и право заключения договора аренды земельного участка. | Начальная цена объекта недвижимости снижена на 50 % Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 201/С-11373 – здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг (здание фельдшерско-акушерского пункта) – одноэтажное бревенчатое здание 1949 г. постройки, общей площадью 105,4 кв. м, фундамент бутобетонный, перекрытия деревянные, крыша шиферная, с двумя холодными кирпичными пристройками, дощатым сараем, забором деревянным, двумя калитками, уборной. Земельный участок: площадью 0,1126 га, кадастровый номер 221850100001003221, срок аренды участка – 99 лет, для размещения объектов здравоохранения и предоставления социальных услуг. Охранная зона линии электропередач напряжением до 1000 В на площади 0,0204 га. | **25 073 008** | **2 507 300** |
| 5. | Здание трансформаторной подстанции, расположенное по адресу: г. Витебск, ул. Карла Маркса, в районе дома № 32, и право заключения договора аренды земельного участка | Начальная цена объекта недвижимости снижена на 20 % Характеристика капитального строения: капитальное строение с инв. № 200/С-57715 – здание специализированное энергетики, трансформаторная подстанция № 4-с, общей площадью 66,0 кв.м, одноэтажное кирпичное, фундамент бетонный, перекрытие железобетонное, крыша рулонная. Земельный участок с кадастровым номером 240100000002003011 площадью 0,0122 га, для содержания и обслуживания трансформаторной подстанции, сроком аренды 99 лет. Ограничения в использовании в связи с нахождением участка в охранной зоне магистральных трубопроводов, систем газоснабжения и других линейных сооружений (ливневая канализация), водопровода, охранных зонах линии электропередач напряжением свыше 1000 В, теплотрассы. | **20 253 155** | **2 025 310** |
| 6. | Здание склада грузового прирельсового с рампой, расположенное по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Друевский с/с, п. Друя, и право заключения договора аренды земельного участка. | Начальная цена объекта недвижимости снижена на 50 % Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 210/С-11360 – (здание нежилое), одноэтажное кирпичное, перегородки – кирпичные, крыша – а/волнистая, общая площадь 385,6 кв.м, бетонные крыльца, бытовое помещение – общая площадь 46 кв.м. Земельный участок: с кадастровым номером 220882710005000001 для размещения объектов железнодорожного транспорта – для обслуживания склада грузового прирельсового с рампой, площадь 0,1276 га, срок аренды 40 лет. Использование – для обслуживания здания склада. | **49 458 964** | **4 945 890** |

**ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон-факс в Витебске: (0212) 476096, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail:votfondgi@tut.by.**

**1. Аукцион состоится 26 октября 2010 г. в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.**

2. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, **последний день приема документов 25 октября 2010 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. **Заключительная регистрация участников 26 октября 2010 с 14.00 до 15.00**. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

3. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903000021, в филиале ОАО «БПС-Банк» по Витебской области г. Витебск, код 150801307. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

**4. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан:** подписать протокол аукциона; **не позднее 10 рабочих дней** со дня принятия решения исполкома о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в сумме 2 миллионов рублей (по каждому лоту), расходы, связанные с формированием земельных участков и изменением земельных участков в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; **не позднее 12 рабочих дней** со дня принятия решения о предоставлении земельного участка заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

5. Подробная информация об условиях участия в аукционе и условиях продажи предмета аукциона опубликована ранее в газете «Звязда» от 03.09.2010 № 172 (26780).

